# Слово Жыцця

Лістадад 2016



**“Усё магу ў тым, хто ўзмацняе мяне”**

*(Флп 4,13)*

Ёсць моманты, калі мы адчуваем сябе задаволенымі, поўнымі сіл, калі ўсё здаецца простым і лёгкім.





Часам акружаюць нас цяжкасці,
якія напаўняюць горыччу нашыя дні.



Можам перажываць нейкую закаханасць у людзей блізкіх,
альбо немагчымасць падзяліцца
з іншымі нашым ідэалам жыцця.



Альбо надыходзяць хваробы, эканамічныя цяжкасці, расчараванне ў сям'і, сумненні, унутраны неспакой, страта працы, вайна - абставіны, якія нас прыгнятаюць і, здаецца, што не будзе ніякага выйсця.



Самым складаным у такіх сітуацыях з'яўляецца тое,
што мы вымушаны сам-насам сутыкнуцца з выпрабаваннямі
жыцця, без падтрымкі хоць каго-небудзь,
хто змог бы даць нам пэўную дапамогу.

Мала хто гэтак жа моцна, як апостал Павел, адчуваў радасці і пакуты, поспехі і непаразуменні. Але ўсё ж ён змог адважна выканаць сваю місію, не ўпаўшы духам.



## Можа, ён быў супергероем?

**Не, ён адчуваў сябе слабым, рыхлым, недарэчным, але ў яго быў сакрэт, які ён даверыў сваім сябрам з Філіпаў: "Я ўсё магу ў тым, хто ўзмацняе мяне."**



*Filippi*

Ён адкрыў у сваім жыцці сталую прысутнасць Хрыста. Нават калі ўсе пакінулі яго, Павел ніколі не адчуваў сябе самотным: Езус заставаўся побач з ім.



Менавіта Ён дадаў яму ўпэўненасці і штурхаў яго, каб ішоў наперад, каб тварам у твар сустракаў усялякую пошасць. Езус цалкам увайшоў у ягонае жыццё, стаўшы ягонай сілай.





**“Усё магу ў тым, хто ўзмацняе мяне”**

*(Флп 4,13)*

Таямніца Паўла можа быць таксама і нашым сакрэтам.



**Усё, што я магу, калі я ў цярпеннях, нават калі я адзін, гэта прызнаць і прыняць таямніцу блізкасці Езуса, які бярэ на сябе гэты мой боль.**



**І магу ўсё, калі жыву ў еднасці любові з іншымі,**
**бо тады Ён - як і абяцаў – ёсць паміж намі** *(Мц 18:20)*,
**і моц адзінства падтрымлівае мяне.**



Усё магу, калі прымаю і рэалізую ў жыцці словы Евангелля: яны дазваляюць мне ўбачыць дарогу, якою я павінен ісці дзень за днём, навучаюць мяне, як жыць, даюць мне ўпэўненасць у сабе.



Я буду мець сілы супрацьстаяць не толькі сваім асабістым выпрабаванням, альбо цяжкасцям у сваёй сям'і, але і ва ўсім свеце вакол мяне.



Гэта можа здавацца наіўным, нейкай утапіяй, бо гэтак вялікімі ёсць праблемы грамадстваў і народаў. Але супраць гэтага "ўсяго" мы можам супрацьстаяць, дзякуючы прысутнасці Ўсемагутнага; "усё" - і адзінае дабро, якое Ён спланаваў у сваёй міласэрнай любові для мяне і для іншых праз мяне.



А калі не адразу гэта спаўняецца, мы працягнем верыць і давяраць плану Божае любові, якая ахоплівае вечнасць, і таму, безумоўна, яно будзе споўнена.





**“Усё магу ў тым, хто ўзмацняе мяне”**

*(Флп 4,13)*



Дастаткова працаваць
"за дваіх" так, як вучыла
К'яра Любіч: "Я не магу
ў нейкім выпадку нічога
зрабіць для гэтага дарагога
мне хворага чалавека ці
ў небяспецы, ці ў гэтай
заблытанай сітуацыі…

**Тады я буду рабіць тое, чаго Бог хоча ад мяне ў дадзены момант: буду добра вучыцца, старанна падмятаць, добра маліцца, добра клапаціцца пра сваіх дзяцей…**



А Бог будзе думаць аб тым, як разблытаць гэты клубок, як суцешыць таго, хто пакутуе, каб разрашыць неспадзяваную сітуацыю.



Гэта ёсць праца для дваіх у дасканалым адзінстве, якая патрабуе ад нас вялікай веры ў Божую любоў да сваіх дзяцей.



Гэты ўзаемны давер робіць цуды. Мы ўбачым, што там, дзе мы не змаглі нечага дасягнуць, мэты дасягнуў Нехта Іншы, хто дапамог больш і нашмат лепш, чым мы."





"Усё магу ў тым,
хто ўзмацняе мяне"

*(Флп 4,13)*

Tekst: Fabio Ciardi OMI

Grafika: Anna Lollo we współpracy z ks. Placido D'Omina (Sycylia - Włochy)

* * *

Ten komentarz do Słów życia jest tłumaczony na 96 języków i dialektów, dociera do kilku milionów ludzi na całym świecie za pośrednictwem druku, radia, telewizji i Internetu - więcej informacji na www.focolare.org/polska/

.

Plik PPS jest tłumaczony na wiele języków i dostępny na stronie www.santuariosancalogero.org